**Литература**

1. *Сиротина И. К.* Основы высшей математики: интерактивный курс. Минск, 2013. URI: http://elib.bsu.by/handle/123456789/41027.
2. *Сиротина И. К., Марченко А. И.* Интерактивные образовательные ресурсы как средство обучения студентов математике // Экономическое образование и современные педагогические технологии. Экономика и предпринимательство: сб. науч. работ. Вып. 6 / Ин-т предпринимательской деятельности. Минск: БГПУ, 2012. С. 55–60.
3. *Коджаспирова Г. М., Коджаспиров А. Ю.* Словарь по педагогике. М.: ИКЦ «МарТ», 2005.
4. *Сиротина И. К.* Интерактивная образовательная среда как фактор оптимизации процесса формирования математической культуры личности // Инновации в науке: материалы XI междунар. заочной науч.-практ. конф. Часть II (15 августа 2012 г.); [под ред. Я.А. Полонского]. Новосибирск: Изд. «Сибирская ассоциация консультантов», 2012. С. 37–46.
5. Программа MyTestX: http://klyaksa.net.

## СЛУЦКАЯ ШКОЛА ЯК БЕЛАРУСКІ АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ

**А. А. Захарэвіч**

Гісторыя сенняшняй гімназіі №1 г. Слуцка бярэ пачатак ажно ў першай чвэрці 17 стагоддзя, а менавіта ў 1617 годзе, калі Януш VI Радзівіл выдаў грамату аб заснаванні ў Слуцку кальвінісцкай гімназіі. [1, с. 93] Калі дакладна ў ейных сценах прайшлі першыя заняткі, не вядома.Варта зазначыць, што напачатку гэта была не гімназія, а пачатковае вучылішча пры кальвінiскім саборы, якое было апісанае як два пакоі з гнілым дахам і печкай ды вокнамі, якія патрабавалі рамонту. Фундаментальны будынак гімназіі быў пабудаваны і адкрыты ўвосень 1630 года, але ўласна гімназія з’явілася раней. У 1625 годзе Хрыштоф Радзівіл, брат Януша VI Радзівіла, выдаў грамату аб заснаванні слуцкай кальвінісцкай гімназіі і вылучэння сродкаў на яе з княжацкіх маенткаў Прошчыцы і Булаховічы [1, с. 94].

Вядомасць гімназія атрымала досыць хутка – яе называлі «Слуцкімі Афінамі», «узорнай Слуцкай гімназіяй» і інш. Папулярнасці школы безумоўна спрыяла ейная даступнасць для бедных саслоўяў (бескаштоўнае навучанне і наяўнасць інтэрнату для бедных дзяцей). Гэтыя факты сведчаць аб тым, што Слуцкую гімназію цалкам справядліва называць асветніцкім праектам, бо яна спрыяла значнаму і прынцыповаму пашырэнню колаў адукаванага насельніцтва. Нягледзячы на тое, што яна была створана пры кальвінісцкім саборы і разлічвалася першапачаткова выключна на хлопчыкаў-кальвіністаў, ужо ў 18 стагоддзі навучацца ў ей ( на тых жа ўмовах, што і кальвіністы), маглі і прадстаўнікі іншых хрысціянскіх вучэнняў [1, с. 98].

Слуцкая гімназія мела свой Устаў, які жорстка рэгламентаваў навучальны і выхаваўчы працэс, паводзіны навучэнцаў на занятках і ў вольны час. «Антычны акцэнт» у тэксце ўставу можна прасачыць і на фармальна-арганізацыйным, і на змястоўным узроўнях. Пафас і спосаб арганізацыі тэксту ўвогуле нагадвае сачыненні антычных філосафаў, а імкненне да татальнай рэгламентацыі нават самых дробных аспектаў адсылае чытача да «Палітыкі» Арыстоцеля і «Дзяржавы» Платона. Аднак было б няправільна сцвярджаць, што гэты ўстаў – адназначная адпраўка да Антычнасці; ен таксама вельмі тыповы і для Асветніцтва – для яго характэрныя рацыянальная аргументацыя, строгая геаметрычнасць, адсутнасць эмацыйных і ірацыянальных складнікаў, імкненне да забяспечання пэўных палітычных і грамадянскіх свабодаў (пазбаўленне дыскрымінацыі паводле ўзросту, сацыяльнага палажэння і веравызнання).

Абапіраючыся на ўстаў школы, можна таксама меркаваць, што ў пытанні ідэалаў асветніцкай веды школьнае кіраўніцтва засноўвала сваю пазіцыю на наступных словах І. Канта: «Асвета не есць замена адніх дагматычных ідэяў іншымі дагматычнымі ідэямі, а самастойнае мысленне [2, с. 29]. У той час, калі Еўрапескія школы адыходзілі ад класічных ідэалаў гуманізму на карысць каталіцкаму і рэфарматарскаму дагматызму, Слуцкая школа адмежавалася ад багаслоўскай закрытасці і заставалася бастыенам еўрапейскага гуманізму.

Што да прадметнага зместу навучальнага працэсу, то Слуцкая школа давала перш за ўсе гуманітарную адукацыю – вучні больш за ўсе займаліся багаслоўем, польскай, лацінскай і нямецкай мовамі, этыкай, рыторыкай, гісторыяй, законазнаўствам. Вучылі яны і матэматыку, але гэтая дысцыпліна разглядалася як уздапаможная для аваладання любой прафесіяй. [1, с. 98] Прызнанне валодання матэматыкай неабходным для любой прафесіі знаходзіцца ў аснове Асветніцкага прынцыпу строгай геаметрычнасці любой веды, і гэта таксама падцвярджае, што Слуцкая школа была асветніцкім праектам.

Да слуцкіх школяроў 17–18 стагоддзя было значна больш патрабаванняў, чым да сенняшніх. Ужо па сканчэнні першага класа яны павінны былі ведаць асновы фармальнай логікі, рыторыкі, правіла складання вершаў і прозы. Уражвае, што нават робячы граматычня практыкаванні, вучні працавалі не з нізкапробнымі і простымі тэкстамі, а з афарызмамі Плаўта, Цярэнція і іншых. Вялікую ролю настаўнікі надавалі развіццю ў вучняў адчування цудоўнага. Навучанне практычнай эстэтыцы адбывалася праз пісьмовыя практыкаванні, асноўнай мэтай якіх было дасягненне найбольшай вытанчанасці ў малюнках і напісанні літар [1, с. 98–100].

Слуцкая школа была адназначна ўдалым асветніцкім праектам. Натуральна, не ўсе ўдавалася адразу, – адчыніўшы свае дзверы для некальвіністаў, школа яшчэ вельмі доўга заставалася недасяжнай для дзяўчынак і жанчын. Тым не менш, пашырэнне грамадскіх правоў і свабодаў, якому спрыяла адкрыцце гэтай гімназіі, уражвае і адназначна заслугоўвае павагі. Вяртанне да практыкі аб'яднання вывучэння граматычных правілаў і антычнай рыторыкі было б дужа карысным для сенняшніх школьнікаў, але гэта не значыць, што трэба бяздумна капіяваць слуцкі асветніцкі праект. Да найлепшых вынікаў прывеў бы крытычны параўнальны аналіз тагачаснай і сенняшняй адуацыйных сістэм і выпрацаванне на аснове гэтага пэўнай сінтэтычнай сістэмы.

**Літаратура**

1. *Кант И.* Ответ на вопрос: что такое просвещение? Собр.соч. в 8 тт. М., 1994. Т. 8. С. 29–37.
2. Антология педагогической мысли Белорусской ССР, М., 1986.

## БЕЛОРУССКИЕ ЭТНОКУЛЬТУРНЫЕ ТРАДИЦИИ В СОВРЕМЕННОЙ ОБРАЗОВАТЕЛЬНОЙ ПРАКТИКЕ

**Н. В. Коваленко**

На сегодняшний день ученые пришли к выводу, что вопросы, связанные с развитием этноса и внедрения этнокультурных традиций в образовательную практику, являются одними из самых актуальных и остродискуссионных. Республика Беларусь обладает самобытной культурой, укоренившимися традициями и обычаями, что является немаловажным потенциалом для развития страны в будущем. Общепризнанным фактом считается, что в основе функционирования любого общества должна быть заложена именно культура, в общем, и этническая идентичность каждого народа, в частном.

С точки зрения кандидата А. Б. Афанасьевой, термин «этнокультура» появился как речевой вариант термина «этническая культура», он распространился в конце XX века. Под этнокультурой понимается совокупность традиционных ценностей, отношений и поведенческих особенностей, воплощенных в материальной, духовной, социальной жизнедеятельности этноса, сложившихся в прошлом, развивающихся в исторической социодинамике и обогащающих этнической спецификой культуру в различных формах деятельностной самореализации людей [1].

По большому счету, этническая культура – есть повседневная культура, которая включает в себя пищу, предметы одежды, жилища, средства передвижения, верования, обряды, ценности, искусство. Это,